

Інфармацыйная культурна-грамадская газета Гарадоччыны

ГАСЦІНЕЦ

№ 8 (251) ТРАВЕНЬ 2018 ГОДА

БЕЛАРУСКІ АФАРЫЗМ

Больш за сябе я Беларусь люблю і ёю з нараджэння ганаруся.

Сяргей Грахоўскі

ПАДРЫХТОЎКА

СБОР ПОЛЬСКОЙ СБОРНОЙ

У нас проходит тренировочный сбор женской сборной Польши вместе с двукратной олимпийской чемпионкой Юстиной Ковальчик.

С 20 мая на лыжероллерной трассе Городка начался тренировочный сбор женской сборной Польши по лыжным гонкам с участием олимпийской чемпионки Ванкувера и Сочи Юстиной Ковальчик.

Национальная сборная Польши по лыжным гонкам под руководством Александра Веретельского 20 мая прибыла в Городок и разместилась в отеле «Спортивный городок». Именно в Городке на лыжероллерной трассе решили начать новый олимпийский цикл руководители женской сборной Польши по лыжам. Выбору в пользу Городка поспособствовали известные белорусские тренеры по лыжным гонкам, которым нравится лыжероллерная трасса и современная инфраструктура Городка.

Польский десант перемещается на сборе на двух микроавтобусах и составляет 14 человек — девять лыжниц во главе с Юстиной Ковальчик и пять человек сопровождения для полноценных трэнеровак.

Юстина Ковальчик и сама тренируется и пробует себя в тренерской работе. Сопровождает польскую команду талисман Юстины пес Марьян.

По словам главного тренера сборной Александра Веретельского местная трасса — хорошее место для первого входа в новый спортивный сезон и может конкурировать с другими местами подготовки. На трассе лыжницы накачивают на лыжероллерах свои объемы работы, сдают контрольные тесты, бегают кроссы и т.д .. Во время подготовки также пользуются и бассейном, который имеется в гостинице «Спортивный городок».

Первый сбор польские лыжницы проведут в Городке до 9 июня.

Леонид Горовой
http://haradoktour.by

ЗАПРАШАЕМ!

ЦЭНТР ЭКАЛАГІЧНАЙ АДУКАЦЫІ

16 траўня быў адкрыты візіт-цэнтр Рэспубліканскага гідралагічнага заказніка " Карыценскі мох", які дае разнастайную інфармацыю аб прыродзе Гарадоцкага раёна, служыць месцам правядзення экалагічных заняткаў і прадастаўлення на пракат турыстычнага рыштунку.

Намаганнямі работнікаў Рэспубліканскага гідралагічнага заказніка " Карыценскі мох" ў Гарадку на вул. Савецкая д. 10 «А» (уваход з боку вуліцы Чырвонаармейскай) створаны візіт-цэнтр для экалагічнай і турыстычнай дзейнасці ў Гарадоцкім раёне. Ва ўрачыстай абстаноўцы візіт-цэнтр адкрылі Сяргей Юшкоў, кіраўнік прыродаахоўчай установы " Карыценскі мох" і Ядзвіга Каўкенава, намеснік дырэктара Гарадоцкага Цэнтра дзяцей і моладзі.

Для першых наведвальнікаў — навучэнцаў экалагічнага гуртка Цэнтра дзяцей і моладзі — вядучы спецыяліст прыродаахоўчай установы «Карыценскі мох» Тацццяна Гаравая правяла першы занятак, распавёўшы аб візіт-цэнтры, пра яго аснашчэнне і магчымасцях для экалагічнай адукацыі і турыстычнай дзейнасці.

У візіт-цэнтры размешчана досыць разнастайная інфармацыя аб Рэспубліканскім гідралагічным заказніку «Карыценскі мох».

Наведвальнікі цэнтра маюць магчымасць азнаёміцца з буклетамі аб заказніках Гарадоцкага раёна, аб турыстычных маршрутах па заказніках «Карыценскі мох» і «Сурміно», па рэках Аўсянка і Обаль, а таксама аб паслугах па арганізацыі і правядзенні экскурсій па экалагічнай сцежцы «Таямніцы балота».

Вядучыя спецыялісты тут раскажуць аб рэліктавых раслінах заказніка — марошка, асацэ малакветкавай, лінеі паўночнай, пра жывёл занесеных у Чырвоную кнігу Рэспублікі Беларусь — рысі, мядзведзі, арэшнікавай соні, бялке палятухе.

У візіт-цэнтры можна паглядзець фільмы пра прыроду, пра жыццё жывёл, аб асабліва ахоўных тэрыторыях.

Таксама экалагічны цэнтр запрашае навучэнцаў і студэнтаў для правядзення экалагічных заняткаў, а яшчэ ў ім маецца пракат турыстычнага рыштунку.

Л. Антонаў
http://haradoktour.by

ЗНАЧНА БОЛЬШ НАВІНАЎ ПРА ГАРАДОК НА HARADOK.INFO

ФУТБОЛ

ВАЛЯВАЯ ПЕРАМОГА

У першым матчы на сваім полі чэмпіяната Віцебшчыны ФК «Дзецкасельскі» (Гарадок) перамог моцны клуб «Славянскі Велес».

26 траўня нашы футбалісты праявіў волю да перамогі спачатку зраўнялі лік, а потым, напрыканцы матча, вырвалі перамогу ў клуба з абласнога цэнтра, які падтрымліваецца Віцебскай птушкафабрыкай і выйграў абласны турнір па міні-футболу.

Першы матч у значнай меры вызначае патэнцыял каманды на ўвесь сезон, бо бачна каго здолелі запрасіць у каманду. Яшчэ ў кубкавым матчы нашы футбалісты па пенальці перамаглі віцебскі «Газавік» і адчулася, што гэта не проста перамога. Таму вельмі цікава было пабачыць у Гарадку тых футбалістаў, якія сабраліся ў дружыну Сяргея Куракова. А да Алега Слауціна, які далучыўся да каманды зімой, на гарадоцкі газон выйшлі і былыя гульці ФК «Віцебск»: Сяргей Вехцеў і Андрэй Баранок. Гэта ў значнай меры і вызначала ход гульні.

З першых мінут наша каманда авалодала ініцыятывай і павяла наступ на браму гасцей. Гульня вялася найперш праз Алега Слауціна, але на браму гасцей былі нацелены і іншыя футбалісты. Між тым забіць у першай трэці першага тайма нам не атрымалася.

А госці, праводзячы вострыя контраткі, з дапамогай Арцема Клопава на 19-й хвіліне паразілі нашу браму.

Гарадоцкія футбалісты ўзмацнілі ціск на гасцей і на вастрыні атакі нашай каманды быў не толькі Алег Слауцін, але і Сяргей Вехцеў, Эдуард Ізафатаў, Дзяніс Фадзееў. Адчувалалася, што гол «наспявае» і лік зраўняюць.

І сапраўды, калі на 26 хвіліне першага тайма Алег Слауцін, як звычайна пачаў рыхтавацца да выканання штрафнога ўдара дзесьці з 30 метраў да брамы гасцей асабліва не верылася, што атрымаецца гол. Але удар выйшаў выдатны — ў правы верхні кут брамы гасцей і галкіпер толькі правёў вачыма мяч, які выкаціўся ў поле...

Потым нашы футбалісты з пераменным поспехам штурмавалі браму гасцей і астатнюю частку першага тайма, і амаль увесь другі тайм, напружваючы абарону гасцей.

Галоўным гульцом стаў іх галкіпер, які пасля ўдара па сваёй браме доўга ішоў — нага за нагу — да сцен макета гарадоцкага замка шукаць у няскошанай траве мяч. Тут падумалася, чаму б у чэмпіянаце не увесці правіла гульні з трыма мячамі, каб галкіпер не млява шукаў мяч у ваколіцах брамы, а браў яго адразу. І чаму б не абавязаць каманду гаспадароў выстаўляць па два юнака для падачы мяча, які выйшаў з гульні? І не толькі ў Гарадку мець такія правілы, а для ўсяго чэмпіяната. Зразумела, гэта прымусіць каманды больш інтэнсіўна весці матч.

Між тым матч ішоў да фінальнага свістка і ў рэшце рэшт галкіпер гасцей на 86 хвіліне памылкова выбег да мяжы штрафной пляцоўкі і не здолеў забраць мяч. Гэтым трапна скарыстаўся Андрэй Баранок і накіраваў тэхнічна мяч у пустую браму. Госці кінуліся адыгрывацца, атрымалі права на штрафной у непасрэднай блізкасці ад нашай брамы, але сценку не прабілі. 2:1 — канчатковы вынік матча.

Першы матч засведчыў, што ў гарадоцкай каманды высокае майстэрства мае не толькі Алег Сауцін, але яшчэ 5-6 гульцоў ды і астатнія футбалісты ствараюць паўнавартасную дружыну, якая — і гэта адчуваецца — можа перамагаць любую каманду чэмпіяната і нацэлена на перамогу ў ім.

Леанід Гаравы

АПЫТАННЕ

ЯК БЫЦЬ З ХАКЕЕМ?

Напрыканцы траўня рэдакцыя сайта прапанавала чытачам адказаць на пытанне “Ці варта далей рабіць стаўку на развіццё хакея ў якасці нацыянальнага каманднага спорту?”.

І зноў слабую актыўнасць праявілі наведвальнікі групы сайта ў Аднакласніках, дзе пры 1700 праглядаў выказалі сваё меркаванне толькі 10 наведвальнікаў. Большую актыўнасць праявілі сябры групы УКантакце, дзе пры 2200 праглядах сваё ананімнае меркаванне выказалі 131 чалавек.

Варыянты адказаў размеркаваліся наступным чынам: “так, трэба далей, мацней развіваць хакей” -- 11.5%; “трэба рабіць нацыянальным спортам футбол” -- 37.4%; “наш спорт – гандбол” -- 3.8%; “усе віды спорту трэба падтрымліваць пароўну” -- 19.8%; “нам трэба старацца стаць краінай навукі і культуры, а не спорту” -- 27.5%.

Відавочна жаданне нашых чытачоў бачыць у прыярытэце футбол, так і жаданне бачыць Беларусь краінай навукі і культуры, а не спорту.

Нагадваем, што гэта апытанне мае рэпрэзентатыўнасць толькі для нашай групы УКантакце. І не больш гэтага.

Л. Антонаў

ПАМЯТЬ

ОТКРЫТИЕ ПАМЯТНИКА МАРШАЛУ

В субботу 19 мая в Городке открыли памятник маршалу Баграмяну. Бронзовый бюст дважды герою Совеского Союза установлен на пересечении улиц, одна из которых названа в его честь и улицы Пролетарской.

В торжественном открытии приняли участие представители областной и районной власти, армянской диаспоры, которая показала финансовую поддержку проекту, родственники маршала, Чрезвычайный и Полномочный Посол Армении в Беларуси Олег Есоян, авторы проекта — архиектор, декан архитектурного факультета БНТУ Армен Сардаров и скульптор Спартак Арутюнян.

Для городокчан событие стало праздником. К прославленному полководцу жители района и региона всегда относились с особым уважением и трепетом. Городокская военная операция, которая осуществлена силами 1-го Прибалтийского фронта под командованием Баграмяна, в декабре 1943 года принесла райцентру долгожданное освобождение. Эта была первая и одна из сложнейших операций для Баграмяна на посту командующего фронтом. Она готовилась и проводилась в исключительно тяжелых условиях против крупных сил противника, которые не только преобладали в численности и боеспособности, но и занимали более выгодные стратегические позиции. Войска 1-го Прибалтийского вели активные наступательные действия в то время, когда 2-й Прибалтийский фронт севернее и Западный фронт южнее, — не добившись успеха в наступлении, перешли к обороне. При подготовке Белорусской стратегической операции летом 1944 года в районе Витебска Баграмян пошел на весьма рискованный шаг, решив нанести главный удар на правом фланге, где открытая болотистая местность не благоприятствовала скрытному сосредоточению и наступательным действиям войск. И риск оправдал себя. За освобождение Беларуси Иван Баграмян получил свою первую звезду героя.

В Городке маршала вспоминают не только как талантливого полководца, но и чуткого к бедам других человека. По его протекции в районе был открыт первый детский дом для сирот, у которых родители погибли на войне. Он общался с воспитанниками, вел переписку, и многим помог в жизни. В день открытия памятника вспоминали о великих свершениях и добрых делах маршала.

Чрезвычайный и Полномочный Посол Армении в Беларуси Олег Есоян, обращаясь к гостям мероприятия, обратил внимание:

— Выдающимися являются те люди, чьи имена вызывают горячие слезы благодарности последующих поколений. И без таких мероприятий, как в Городке, этих слез не будет, как и памяти о подвигах героев.

Дипломат отметил важность того, что не только в Городке, но и в целом во всей Беларуси чтят память освободителей. Он поблагодарил местную и областную власть, а также похвалил райцентр за ухоженность и красоту.

К словам благодарности присоединился внук дважды героя Советского Союза и его тезка Иван Баграмян. Он подарил райисполкому новую книгу о прославленном полководце, а также презентовал дедовские командирские часы.

Завершился праздник в Городке вечером дружбы "Одна судьба — одна Победа" посвященный воинам — армянам, которые принимали участие в освобождении Беларуси.

Андрей ЗАХАРОВ
«Беларусь сегодня»

ПАРТНЕРСТВА

СУВЯЗЬ З КОХТЛА-ЯРВЕ

Эстонская дэлегацыя наведала аб'екты Гарадка ў межах візіту на Віцебшчыну: Гарадоцкі каледж, лыжаролерную трасу і спорткомплекс.

Сустрэча кіраўніцтва Віцебшчыны з дэлегацыяй горада Кохтла-Ярве з Эстоніі прайшла ў аблвыканкаме. У яе ходзе бакі абмяркоўвалі перспектыўныя сферы для супрацоўніцтва — медыцына, адукацыя, культура, спорт, мясцовае самакіраванне. Эстонская дэлегацыя запрасіла беларусаў здзейсніць візіт у адказ, каб абмяняцца вопытам, у тым ліку пазнаёміцца са сферай адукацыі і распавесці аб рабоце электроннага дакументазвароту ў Эстоніі.

— У першую чаргу бачу перспектывы развіцця паміж нашымі рэгіёнамі ў культуры і адукацыі, — адзначыла мэр горада Кохтла-Ярве Людміла Янчанка. -Таксама зацікаўлены ў наладжванні кантактаў з бізнесам Беларусі. У нас прамысловы рэгіён, дзе здабываюць і перапрацоўваюць сланец, ёсць тэхнапарк.

Паводле яе слоў, у рэгіёне маецца льготная паслабленні для прадпрымальнікаў, у прыватнасці адсутнічае падатак на прыбытак. Таксама мэр дадала, што гэтым летам студэнты-медыкі з каледжа ў Кохтла-Ярве прыедуць на практыку ў віцебскія медустановы.

Старшыня абласнога Савета дэпутатаў Уладзімір Цярэнцьеў прапанаваў у будучыні больш актыўна ўдзельнічаць у культурных, спартыўных мерапрыемствах і праектах. Кіраўнік дэпутацкага корпуса вобласці запрасіў калектывы Эстоніі на фестывалі ў Браслаў, Паставы, Дуброўна, Глыбокае, на фестываль сучаснай харэаграфіі IFMC і «Славянскі базар у Віцебску».

Старшыня дэпутацкай групы па парламенцкіх сувязях з Беларуссю ў Дзяржаўным сходзе Эстоніі Валерый Корб распавёў, што на ўзроўні парламентаў нашых краін супрацоўніцтва вядзецца даўно.

У сваю чаргу дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Віктар Мірош адзначыў, што далейшыя ўзаемныя кантакты паміж парламентамі Беларусі і Эстоніі будуць працягвацца і выходзіць на новы ўзровень.

Эстонскіх гасцей чакае насычаная праграма візіту. Учора яны наведалі Віцебскае кадэцкае вучылішча, Гарадоцкі дзяржаўны аграрна-тэхнічны каледж, лыжаролерную трасу ва ўрочышчы Вераб'ёвы горы, спарткомплекс абласнога цэнтра алімпійскага рэзерву па зімовых відах спорту. Сёння дэлегацыя наведвае музеі Віцебска і музей-сядзібу Ільі Рэпіна «Здраўнёва», а таксама Віцебскую ГРЭС і прадпрыемства «Віцебскія пад'ёмнікі».

Паводле:
http://www.vitbichi.by

ІНВЕСТЫЦЫІ

КАРДИНАЛЬНОЕ ОБНОВЛЕНИЕ ЕЗЕРИЩА

Около сотни объектов отремонтируют в Езерище к 75-летию освобождения от немецко-фашистских захватчиков.

В декабре северный форпост Витебщины будет отмечать 75-летие освобождения от немецко-фашистских захватчиков — это серьезная мотивация для успешного обновления населенного пункта. Стратегическая цель — запустить процесс саморазвития территории.

Горпоселок включен в программу благоустройства населенных пунктов Витебщины, разработанную по поручению главы государства и рассчитанную на пять лет. Планируется, что ежегодно будут приводиться в порядок по два поселка (в этом году второй — это Болбасово), имеющих потенциал для получения значимых экономических и социальных эффектов.

За основу взят горпоселок Копысь Оршанского района. На его примере реализованы основные элементы концепции «деревни будущего», разработанной институтом «БелНИИПградостроительства». Ее суть — поддержание социальных стандартов в сельской местности на уровне, максимально приближенном к городскому.

На днях на областном штабе под руководством председателя областного Совета депутатов Владимира Терентьева скорректирована дорожная карта работ по преображению горпоселка, поставлены четкие задачи предприятиям и организациям по объемам, срокам и источникам финансирования ремонта. Такой управленческий механизм позволяет более эффективно использовать ограниченные инвестиционные ресурсы.

Как отметил Владимир Терентьев, Езерище выбрано не случайно. Расположенный в считанных километрах от белорусско-российской границы горпоселок является въездными воротами в регион и при этом остается запущенным, в отличие от аналогичных населенных пунктов по периметру области, которые приведены в порядок. Поэтому программа по его благоустройству получилась объемная и напряженная. Особое внимание участники заседания уделили объектам социальной сферы, состояние и тактику преобразования которых определяли непосредственно при посещении бюджетных учреждений.

Серьезные изменения ждут здание средней школы и прилегающую территорию, детский сад, больницу, Дом культуры, около двух десятков жилых домов. Будет приводиться в порядок инженерно-транспортная инфраструктура, в том числе планируется заменить примерно четверть водопроводно-канализационных сетей, обновить покрытие на трех улицах, а также транспортные артерии близ горпоселка.

В программе предусмотрены установка двух детских площадок, совершенствование уличного освещения (появятся 80 современных светильников), организация контейнерных площадок для мусора. Витебский облпотребсоюз приводит в порядок свои объекты торговли и общепита, параллельно работает с потенциальными инвесторами по вовлечению в оборот пустующих сооружений. Работы много, поэтому всем службам и предприятиям необходимо активнее включаться в процесс, дабы в срок отчитаться перед жителями об успешном решении задач, а не оправдываться за нерасторопность и организационные промахи.

— На данный момент должна быть полностью готова документация, чтобы строители приступали к работе на объектах, однако отдельные структуры проспали, поэтому на штабе в их адрес звучала критика, — отметил глава облсовета, добавив, что подобные заторможенность и выжидательная позиция недопустимы и могут привести к серьезным последствиям, в том числе кадровым.

Преобразования затронут буквально каждый уголок горпоселка, так что и жителям будет где проявить активность и инициативу. Например, невооруженным глазом видно, что, к сожалению, сегодня Езерище начинает зарастать — а это уже зона ответственности местных сообществ.

— Райисполком отвечает за координацию общего фронта работ, а сельсовету необходимо организовать жителей горпоселка, — расставил акценты Владимир Терентьев. — Сельчане могут осмотреться, что происходит вокруг их домов, участков, и привести эти территории в порядок.

Впрочем, и областные власти, и районные руководители, и местные жители понимают: для того, чтобы у горпоселка было будущее, надо развивать экономический потенциал территории. Этот аспект, кстати, был определяющим при формировании списка населенных пунктов для включения в программу.

Как пояснил Владимир Терентьев, выбор пал на те из них, которые сохраняют перспективы развития. Поэтому сегодня прорабатываются вопросы размещения производств, создания предприятий, привлечения в горпоселок инвесторов. Иначе силы и ресурсы, затраченные на наведение внешнего лоска и создание комфортных условий проживания, окажутся безрезультатными.

Сергей Антонов
«Витебские вести»

БЕЛАРУСЬ–РАСІЯ

НАВОШТА ПУЦІНУ ЕХАЦЬ У БЕЛАРУСЬ?

Чаго чакае афіцыйны Мінск ад новага прэзідэнцкага тэрміну Уладзіміра Пуціна? Я згодны з высновамі большасці экспертаў, што ўступленне Уладзіміра Пуціна ў новы прэзідэнцкі тэрмін істотна не паўплывае на стан двухбаковых дачыненняў паміж дзвюма краінамі.



Пасля шматмесячнага перапынку Аляксандр Лукашэнка і Уладзімір Пуцін нарэшце правялі кароткія перамовы на палях саміту ЕАЭС. За гэты час назапасілася шмат спрэчных пытанняў, якія варта было б абмеркаваць.

Але, здаецца, у дадзены момант на першае месца выходзіць фармальнае, сімвалічнае пытанне. У міжнароднай палітыцы існуе традыцыя, што першы замежны візіт новы кіраўнік дзяржавы ці ўраду ажыццяўляе ў тую краіну, якая з'яўляецца для яго найбольш важным партнёрам. Гэта дэманстрацыя замежна-палітычнага прыярытэту. Дарэчы, за гэтым уважліва сочаць эксперты, СМІ, з гэтага робяць важныя высновы…

Відавочна, што цяпер беларускі правадыр вельмі хацеў бы, каб зноў першы візіт Уладзіміра Пуціна пасля яго інаўгурацыі адбыўся менавіта ў Мінск. Выкажу меркаванне, што менавіта гэтае пытанне было галоўным падчас сустрэчы двух лідараў у Сочы.

І такі візіт анансаваны. Аляксандр Лукашэнка 9 мая падчас святочных урачыстасцяў з гонарам расказаў, што чарговае пасяджэнне Вышэйшага дзяржсавету Саюзнай дзяржавы Беларусі і Расіі запланавана правесці ў Мінску. Гэта адбудзецца ў трэцяй дэкадзе чэрвеня…

Аднак усё гэта фармальны, сімвалічны бок беларуска-расійскіх адносін. Звернемся да змястоўных пытанняў.

Я згодны з высновамі большасці экспертаў, што ўступленне Уладзіміра Пуціна ў новы прэзідэнцкі тэрмін істотна не паўплывае на стан двухбаковых дачыненняў паміж дзвюма краінамі. Саюзніцкія адносіны захаваюцца, хоць, як звычайна, ім будуць спадарожнічаць бясконцыя канфлікты і скандалы. Можна канстатаваць, што сёння Мінск і Масква па-рознаму бачаць парадак дня стасункаў паміж краінамі.

Найперш, Беларусь імкнецца забяспечыць свабодны і прыярытэтны доступ беларускай прадукцыі на расійскі рынак. Гаворка не толькі пра харчовыя тавары (малако і мяса). Мінск дамагаецца, каб захады ўраду Расіі па абароне нацыянальнага вытворцы не пашкодзілі беларускім прадпрыемствам, каб нашы тавары мелі такія ж ільготы на тэрыторыі РФ, як і ўласна расійскія.

Цягам усіх гадоў так званай «беларуска-расійскай інтэграцыі» галоўнай праблемай, вакол якой адбываецца супрацьстаянне паміж Мінскам і Масквой, з'яўляецца пытанне энергарэсурсаў. Беларусь, як звычайна, імкнецца атрымаць расійскі газ і нафту на як мага больш ільготных умовах, Расія квола супраціўляецца. Гэтым разам усе энергетычныя пытанні вырашаныя да 2019 года. Цяпер ідуць перамовы пра цэны і ўмовы паставак энергарэсурсаў у наступныя гады.

І вось тут можа ўзнікнуць адна праблема. Яна моцна звязаная з тым канфліктам паміж Расіяй і Захадам, які хутка нарастае.

Запаветная мара беларускага кіраўніцтва — з 2025 года перайсці на ўнутраныя расійскія кошты на энерганосьбіты. Уласна кажучы, гэта быў галоўны пернік, з дапамогай якога Масква ўцягнула Мінск у Мытны саюз і ЕАЭС. Справа ў тым, што гэта абяцанне Крамля зыходзіла з тагачасных планаў кіраўніцтва РФ да 2025 года перавесці ўнутраныя расійскія кошты на энерганосьбіты на ўзровень сусветных. Гэта было часткай стратэгіі інтэграцыі Расіі ў сусветную эканоміку. У сувязі з чым Расія брала пэўныя абавязальніцтвы перад уступленнем у Сусветную гандлёвую арганізацыю (СГА).

Але з таго часу сітуацыя радыкальна змянілася. Цяпер, калі супраць Расіі ўводзяць эканамічныя санкцыі, яе спрабуюць выкінуць з працэсаў глабалізацыі, яна апынулася ў ізаляцыі, Масква ў адказ можа абнуліць усе свае абавязальніцтвы перад СГА і адмовіцца ад ранейшых планаў. Бо яны прымаліся ў іншых умовах. У выніку ўсе разлікі беларускага ўраду пагражаюць так і застацца марамі. А гэта можа выліцца ў вялікі скандал у адносінах паміж саюзнікамі.

І прыкметы гэтага канфлікту ўжо праглядаюцца. На саміце ЕАЭС у Сочы Лукашэнка заявіў: «На жаль, зноў не гатовыя для абмеркавання на вышэйшым узроўні праграмы фармавання агульных рынкаў газу, нафты і нафтапрадуктаў. Спадзяемся, што хаця б да канца бягучага года мы паставім подпісы пад гэтымі асноватворнымі дакументамі. І не трэба тут падазраваць Беларусь, што гэта толькі ў інтарэсах Беларусі. Мы дамовіліся, што мы вырашым гэтае пытанне, значыць, яго трэба вырашаць».

Яшчэ адной праблемай беларуска-расійскіх адносін становіцца вайскова-тэхнічнае супрацоўніцтва. Расія адмаўляецца пастаўляць у Беларусь найноўшае ўзбраенне (самалёты, ракетныя комплексы) нават за грошы. Бо, па-першае, не вельмі давярае саюзніку. Па-другое, Масква хоча прымусіць такім чынам Мінск на размяшчэнне сваіх вайсковых базаў на беларускай тэрыторыі.

Акрамя таго, у 2020 годзе заканчваецца тэрмін дзейнасці пагаднення аб знаходжанні ў Беларусі двух расійскіх вайсковых аб'ектаў — радыёлакацыйнай станцыі пад Ганцавічамі і станцыі сувязі ВМФ Расіі пад Вілейкай. Умовы новага пагаднення могуць стаць прадметам вострых дыскусій паміж саюзнікамі.

Ці яшчэ адна тэма для рознагалоссяў: Беларусь не атрымала чарговыя траншы ад Еўразійскага фонду стабілізацыі і развіцця ў памеры 400 мільёнаў долараў. Яны павінны былі паступіць у першым квартале 2018 года. Хутка скончыцца другі квартал, а грошай няма. Фонд лічыць, што беларускі бок не выканаў усе ўмовы крэдытнай праграмы.

Дарэчы, у гэтым годзе Беларусь павінна заплаціць Расіі 1 мільярд 7,5 мільёна долараў доўгу за мінулыя крэдыты. І, як звычайна, Мінск будзе прасіць аб рэфінансаванні запазычанасці. Гэта значыць, прасіць новы крэдыт.

Са свайго боку, Расія хацела б ад Беларусі большай лаяльнасці, большай падтрымкі замежнай палітыкі Масквы. Бо атрымліваецца, што ў сваёй канфрантацыі з Захадам Крэмль апынуўся без саюзнікаў. Гэта для Масквы даволі дыскамфортна. Таму Пуцін будзе ціснуць на Беларусь, патрабаваць стаць у адзін шэраг.

Увогуле, апошнім часам у палітыцы Беларусі назіраецца дзіўны парадокс. Эканамічная залежнасць ад Расіі не змяншаецца, а ў замежнай палітыцы афіцыйны Мінск усё больш дыстанцуецца ад Масквы. Нейкі час можна сядзець у такім шпагаце. Але ці доўга?

Валеры Карбалевіч
"Новы час"

«ТУНЕЯДЦЫ»

ДЕЛАТЬ БИЗНЕС И КОПАТЬ ОГОРОДЫ

17 мая депутаты Палаты представителей рассматривали новый декрет «о тунеядстве». Его поддержали все депутаты за исключением двух представителей оппозиции — Елены Анисим и Анны Канопацкой. В специальных комиссиях уже знают, какие варианты будут предлагать «тунеядцам», чтобы те считались задействованными в экономике.

Обновленный декрет о содействии занятости населения депутатам представляла министр тура и соцзащиты Ирины Костевич. По новому декрету «тунеядцев» обяжут возмещать полную стоимость газоснабжения, подогрева воды и отопления.

К «тунеядцем» подойдут индивидуально

Сейчас на местах идет процесс обновления состава комиссий, которые будут заниматься координацией работы по содействию занятости населения. Туда будут входить местные чиновники, депутаты, члены ФПБ и других пропгосударственных общественных организаций.

Таким комиссиям даже дадут право рекомендовать отправлять в ЛТП тунеядцев, ведущих асоциальный образ жизни.

В течение июня Минтруда планирует разработать памятки для комиссий.

«Мы, конечно, ставили задачу перед комиссиями выслушать каждого человека с точки зрения понимания его ситуации. Включить его в список на полную оплату — это не цель. Прежде всего, это индивидуальный подход, чтобы оказать человеку содействие», — пояснила журналистам Ирина Костевич.

Министр добавила, что тех, кого признают незадействованными в экономике, будут приглашать на заседание комиссий, но идти туда они не обязаны.

Naviny.by узнали, как будут работать комиссии, которым решать, тунеядец вы или нет.

«Тунеядцы» смогут взять на стартап 3 тысячи рублей

Например, в Пружанском районе специальная комиссия уже сформирована. В ее состав вошли 17 человек. Сейчас в районе 99 официально безработных и 381 вакансия.

«Работу у нас можно найти как на предприятиях малого бизнеса, так и на государственных предприятиях. Вакансий у нас больше, чем людей, которые стоят на учете в центре занятости. Мы будем работать по тем документам, которые у нас есть. Если, например, у вас есть приусадебный участок и вы занимаетесь огородничеством, то вы уже не тунеядец», — пояснили в комиссии Пружанского района.

Что предлагает в Пружанском районе потенциальному тунеядцу общереспубликанский банк вакансий? Самая «вкусная» зарплата — на предприятии «Родина», директору предлагают 900 рублей. Остальные вакансии — от 230 до 550 рублей. Чаще всего требуются трактористы.

В Каменецком районе в «тунеядской» комиссии 21 человек. Официальных безработных немного — 28 человек, и 200 вакансий от службы занятости. В уже сформированной комиссии не занятым в экономике дают еще один совет — делать свой бизнес.

«Тем, кто решит заняться бизнесом, предусмотрена даже денежная помощь от государства. А мы поможем спланировать такой бизнес», — рассказали в комиссии.

Размер денежной помощи зависит от места жительства: городской «тунеядец» может получить на свое дело 3 тысячи рублей, сельский — 2 тысячи рублей.

Министерство труда обещает сформировать базу «тунеядцев» до 1 декабря. А уже в 2019 году признанные «тунеядцами» граждане будут обязаны платить за газ, подогрев воды и теплые батареи по стопроцентным тарифам.

Артем Мартынович
https://naviny.by

КОШТЫ

ЦЕНЫ ОПЕРЕЖАЮТ ИНФЛЯЦИЮ

Цены в магазинах растут намного больше, чем инфляция по Белстату: разница в два раза. Почти два года назад в Беларуси произошла деноминация: 1 июля 2016 года миллионы превратились в тысячи. С тех пор белорусы подозревают, что цены в магазинах растут намного больше, чем кажется. Просто из-за копеек это незаметно.

Два года назад редакция Еврорадио сформировала небольшой продуктовый набор и сделала их фотографии с ценниками. Сегодня мы пошли в те же магазины и рассмотрели ценники на те же продукты.

Больше всего выросла в цене клюквенная настойка «Бульбашъ» — с 8,21 до 12,14 рубля, то есть на 47%. Но если употребить настойку под филе сельди в масле «Vici», это немного компенсирует инфляцию пития, ведь селёдка подешевела на 4%.

Молоко «Малочны гасцінец» по ценникам подорожало на 31%, а цена на сметану «Пан Мысліцкі» выросла на 20-28%, в зависимости от жирности.

Зато намного меньше (сразу на 17%) белорусы платят за растительное масло «Олейна», которое до деноминации стоило 3 рубля 38 копеек, сегодня — 2,82 рубля. Ну, и наш странный набор продуктов за всё это время подорожал на 22%.

Интересно, что у Белстата другая инфляция, угадайте в какую сторону. С июля 2016 по апрель 2018 года цены на продукты питания в Беларуси повысились на 11%. Сметана подорожала на 22,6%, молоко — на 21,2%, стоимость подсолнечного масла снизилась на 3,8%.

В стране Белстата жить лучше. Но экономист Леонид Фридкин спешит защитить Национальный статистический комитет и объясняет, почему реальная инфляция не совпадает с официальной.

«Мы смотрим, например, как резко подорожал шоколад. Но виновата в этом не деноминация и не жадность наших кондитеров. Проблема в том, что в мире существенно подорожали какао-бобы, и это повлияло на конечную продукцию. Поэтому все претензии к тому, что в Гане подорожали какао-бобы.

С другой стороны, вот растительное масло. Если мы посмотрим индексы цен ФАО, то увидим, что на биржах цены на многие продукты питания, в том числе на растительное масло, опускались из-за того, что в мире были высокие урожаи, а баловаться с биотопливом желающих становится всё меньше. То есть отголоски глобальных процессов отражаются на ценниках, которые мы видим на своих прилавках.

Цены на алкоголь сильно зависят от уровня акцизов. Поскольку на многие виды алкоголя цены ещё остаются регулируемыми, то динамика цен не совпадает с общим уровнем инфляции. То же самое происходит со многими другими продуктами».

По словам Фридкина, многие белорусские производители сильно ориентируются на российский рынок, производят гораздо больше, чем могут съесть белорусы. Казалось бы, на нашем рынке цены должны быть ниже, но нет. Высокими ценами для белорусов компании компенсируют экспортные затраты.

«В расчёте инфляции действует очень сложная схема. Если взять какой-то набор 10-15 продуктов и посчитать среднее арифметическое, то это не будет показателем инфляции», — заверяет экономист.

Но глаза не обманешь: когда читаешь, что в 2017 году инфляция удержалась в пределах 5%, а потом подсчитываешь, что молоко подорожало на 31%, чувства охватывают странные.

https://euroradio.fm

КАНАНІЗАЦЫЯ

У ІМЯ АЙЦА І СЫНА І СЬВЯТОГА ЧОРТА

Гадоў каля дваццаці таму ў Расеі кананізавалі цара Мікалая II, якога датуль называлі «крывавым». Сёньня можна сустрэць праваслаўнага харугваносца з ордэнам Леніна ў несьмяротным палку. Галоўнай фігурай сваёй гісторыі расейскі народ, нібыта, назваў Сталіна, і ўжо ніхто не зьдзіўляецца прапановам абʼявіць сьвятым наступнага «крывавага». Хто далей? Дʼябал? Яшчэ далей толькі марсіяне.

Міністар унутраных справаў РБ Шуневіч душою ўвесь у гэтых фантасмагарычных працэсах, тым больш фантасмагарычных, што целам ён — у незалежнай краіне Беларусі. Гэта ён вывеў на вуліцы «супрацоўнікаў у цывільным» і тым самым дэ факта легалізаваў дзяржаўны бандытызм. Гэта ён носіць форму сталінскага НКВД. Гэта пры ім колькасьць нічым не матываваных нападаў міліцыі на грамадзян вырасла ў разы (тым самым — рапартуе: зьменшылася колькасьць злачынстваў!). Гэта яго так моцна хвалююць (што б вы падумалі?) вясёлкавыя сьцягі на заходніх пасольствах.

«Мы мяркуем, па-першае, што не рэагаваць на падобнага кшталту падзеі мы ня маем ніякага права. Гэта ўнутраная справа, у тым ліку нашага міністэрства... Я называю гэта прапагандай таго вобразу жыцьця, які нам непрымальны... і вялікіх імунітэтаў, на жаль, апроч нашай гісторыі і рэлігіі, няма».

«Вобраз жыцьця непрымальны» каму? — Шуневічу, міліцыі, народу? Мне, напрыклад, непрымальна, каб чыноўнік, пастаўлены іншым чыноўнікам бяз згоды народа, выказваўся ад імя гэтага народа. Ні на хвіліну не сумняваюся, што гэты аматар НКВД можа займаць пасаду міністра толькі пры Лукашэнку, а не пры Беларусі ці беларускім народзе ці нават пры нейкім іншым Лукашэнку. Чыноўнік, абавязак якога забясьпечваць парадак, ня мусіць рэагаваць на сьцяг на пасольстве Вялікабрытаніі ўжо хоць бы таму, што сьцяг гэты грамадзкага парадку не парушае. Сытуацыю ратуе тое, што ў чыноўніка кароткія рукі. Быў бы сьцяг у руках грамадзяніна РБ — капцы таму грамадзяніну. Замучаюць і пры тым ніколі не прызнаюць за што. Маўляў, «лаяўся матам».

«Наша гісторыя» для Шуневіча — гэта сталінскі НКВД. Але Беларусь не Расея. Тут адносіны да незаконных рэпрэсіяў сталінскіх часоў іншыя, яны ня могуць трактавацца і не трактуюцца людзьмі як «свае», а далей — як нешта пазытыўнае і тое, што «можам паўтарыць». Ні ў адным апытаньні беларусаў Сталін не займаў і ня можа займаць першае месца, колькі б ні стараўся на нашай зямлі рускі тэлевізар.

З «нашай рэлігіяй» яшчэ больш складана. Беларусь, у адрозьненьне ад Расеі, ня монаканфэсійная краіна, дзе царква зраслася зь дзяржавай, то бок адбыўся, як кажуць злапыхацелі, «саюз воров с попами». Беларусь шматканфэсійная. Прычым рэальна актыўныя ў веры пратэстанты і каталікі пераважваюць праваслаўных, якія зазвычай выконваюць нейкія каляндарныя дзеяньні, таму што так робяць усе або таму, што так паказвае рускі тэлевізар.

Што гэта значыць? Што кананізацыя чорта, калі да гэтага дойдзе ў Маскве, ніколі ня будзе прынятая людзьмі ў Беларусі. І пасяліць гэтага чорта ў душах людзей будзе ня менш складана, чым Шуневічу дацягнуцца да вясёлкавага сьцягу на брытанскім пасольстве.

Сяргей Дубавец
“Радыё Свабода”

“ПАКАРАННЕ”

ЛУКАШЕНКО «НАКЛОНИЛ» ГЛАВ ОБЛАСТЕЙ

Председателям Витебского и Могилевского облисполкомов объявлены замечания за несвоевременную выплату зарплат на предприятиях региона.

Александр Лукашенко недоволен работой председателей Витебского и Могилевского облисполкомов Николая Шерстнева и Владимира Доманевского. Обоим объявлено замечание за то, что они не выполнили поручение о своевременной выплате заработной платы.

Подробности не сообщаются. Чем же могли провиниться чиновники?

По статистике, именно в этих двух регионах больше всего организаций, которые задолжали своим работникам по зарплате. По данным на 1 мая 2018 года, в Витебской области их насчитывалось 80, а в Могилевской области — 56. Для сравнения: в Минске — 17, Минской области — 12, Гродненской области — 5, а в Гомельской и Брестской областях — ни одного.

По размеру просроченной задолженности первое место также занимает Витебская область. На начало мая организации этого региона задолжали работникам 3,829 млн рублей.

А вот Могилевская область занимает третье место с просроченной задолженностью в 2,504 млн. Опережает ее Минск с суммой в 3,501 млн рублей. Четвертое и пятое место занимают Минская и Гродненская области. Там просроченная задолженность составила 1,888 млн рублей и 157 тысяч рублей, соответственно.

В Комитете по труду, занятости и социальной защите Могилевского облисполкома Naviny.by рассказали, что из общего числа задолжавших организаций две являются строительными и находятся в процедуре ликвидации, а остальные — сельскохозяйственные.

«У нас в предыдущие месяцы такой сложной ситуации не было. Она возникла тем, что возникла неотложная необходимость направления части денежных средств на весенне-полевые работы. Это залог будущего урожая, будущих финансовых поступлений», — объяснили в комитете.

Сейчас ситуация нормализуется, отметили в Могилевском облисполкоме. Из 56 организаций в списке должников осталось 17: «Сегодня или максимум в понедельник заработная плата в этих организациях будет закрыта».

В Витебской области большинство должников — также сельхозпредприятия. Две промышленные организации и одна из сферы ЖКХ находятся в стадии ликвидации.

«У нас практические все организации, которые имеют задолженность по заработной плате, — именно сельские. А село у нас традиционно — зона рискованного земледелия. Наши организации всегда находились в более худшем финансовом положении [по сравнению с другими областями]», — объяснили Naviny.by в Комитете по труду занятости и социальной защите Витебского облисполкома.

В ведомстве надеются, что ситуацию помогут исправить президентские указы, направленные на улучшение финансового положения сельхозорганизаций.

«Это не какие-то вливания, чтобы предприятие заплатило заработную плату с этих денег. Там идут рассрочки и отсрочки по задолженности, гарантии под кредиты, реорганизация предприятий. Там идет огромная работа, чтобы предприятие окрепло. А если предприятие будет крепко стоять на ногах, оно не будет не выплачивать деньги», — отметили в Витебском облисполкоме.

На проблемы с выплатой заработных плат, в том числе и в Витебской области, ранее обращали внимание в Генеральной прокуратуре и Федерации профсоюзов Беларуси.

«Одно из основных прав наших граждан — право на своевременность выплаты заработной платы. Этот вопрос стоит на особом контроле у органов прокуратуры. Только за прошлый год нами было привлечено к административной, дисциплинарной и материальной ответственности более 1,5 тысячи должностных лиц. От решения этой проблемы зависит как повышение эффективности производства, так и рост благосостояния людей, благоприятный социально-психологический климат в обществе», — говорил на круглом столе в марте этого года начальник управления Генпрокуратуры по надзору за исполнением законодательства и законностью правовых актов Андрей Мальцев.

Алексаендр Ярошевич
“БЕЛАПАН”

Заснавальнік і рэдактар: Гаравы Леанід Антонавіч

Адрас рэдакцыі: 211573, г. Гарадок, вул. Гагарына, д.30Б, кв.16. E-mail: 250318@list.ru Тэл. 8-02139-5-08-52, маб. + 375(29)6723842 (V), Газета выдаецца з сакавіка 1998 г.

Падпісана да друку 30.05.2018 у 18.45 Наклад: 290 асобнікаў. Выдаецца адзін-два разы на месяц на беларускай і расійскай мовах.

Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы дзеля палемікі, не падзяляючы пазіцыі аўтараў. Друкуецца на абсталяванні аднадумцаў. Распаўсюджваецца бясплатна дабраахвотнікамі.